■ Спорт-тайм

# ПЛЫЎЦЫ Б'ЮЦЬ РЭКОРДЫ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі адкрытага чэмпіянату Беларусі па плаванні, пасяховым выступленні самбістаў на чэмпіянаце свету, навабранцаў вышэйшай лігі чэмпіянату краіны па футболе і выступленні айчынных гандбольных клубаў у міжнародных турнірах.**

**1 У Брэсце прайшоў адкрыты чэмпіянат Беларусі па плаванні ў 25-метровым басейне.** За тры дні спаборніцтваў спартсменамі ўстаноўлена 9 рэкордаў Беларусі, пяць з іх на рахунку 21-гадовага Ілы Шымановіча. Плывец з Мінска ў першы дзень чэмпіянату (у кваліфікацыі) пераадолеў 200 м брасам за 2 хв. 06,86 сек і перасягнуў ранейшае дасягненне Аляксандра Гукава, якое было ўстаноўлена ў 1997 годзе. У вырашальным заплыве за медалі Шымановіч стаў першым і палепшыў свой жа вынік — 2 хв. 06,56 сек. У наступныя два дні чэмпіянату Ілья абнавіў яшчэ тры дасягненні Беларусі. У кваліфікацыі на 50 м брасам плывец скінуў адну сотую секунды з ранейшага нацыянальнага рэкорду, паказаўшы час — 27,00 сек. У фінале мінчанін пабіў свой жа рэкорд, запісаўшы ў актыў 26,99 сек. Ілья Шымановіч паказаў лепшы час краіны і на 100 м брасам (59,10 сек).

Яшчэ два рэкорды Беларусі былі пабітыя на дыстанцыі 200 м на спіне. У кваліфікацыі Андрэй Добрыца палепшыў дасягненне Мікіты Цмыга, паказаўшы вынік 1 хв. 55,98 сек. У фінале Мікіта Цмыг узяў рэванш, праплыўшы дыстанцыю за 1 хв. 54,10 сек.

Таксама два рэкорды на «кароткай» вадзе дабавілі квартэты. У першы дзень спаборніцтваў Антон Латкін, Яўген Цуркін, Віктар Стаселовіч і Арцём Мачэкін у эстафеце 4х50 м вольным стылем не пакінулі шанцаў канкурэнтам — 1 хв. 27,48 сек., а змяшаная эстафета 4х50 вольным стылем у складзе Яўгена Цуркіна, Арцёма Мачэкіна, Юліі Хітрай і Аляксандры Герасімені пераадолела дыстанцыю за 1 хв. 32,32 сек.

Адзначым, што на адкрытым чэмпіянаце краіны ў 25-метровым басейне, акрамя гаспадароў, змагаліся спартсмены з Малдовы, Расіі і Эстоніі. Гэты старт папярэднічае чэмпіянату Еўропы на «кароткай» вадзе, які з 2 па 6 снежня пройдзе ў Ізраілі.

**2 Трынаццаць медалёў выйгралі беларускія спартсмены на чэмпіянаце свету па самба, які завяршыўся ў мараканскай Касабланцы.** Святлана Цімашэнка заваявала «золата» ў катэгорыі да 80 кг, таксама медаль найвышэйшай пробы атрымаў Іван Анісквіч у катэгорыі да 62 кг. Сярэбранымі прызёрамі сталі Тацццяна Мацко (64 кг) і Кацярына Пракапенка (60 кг). На рахунку зборнай Беларусі таксама 9 бронзавых узнагарод, на трэцюю прыступку п'едэстала падняліся: Юрый Рыбак (звыш 100 кг), Лізавета Маісеенка (звыш 80 кг), Анастасія Архіпава (56 кг), Марына Жарская (52 кг), Уладзіслаў Бурдзь (57 кг ), Сцяпан Папоў (74 кг), Яўген Сёмачкін (да 100 кг), Андрэй Казусёнак (да 90 кг) і Крысціна Жукавец (да 72 кг).

У камандным заліку чэмпіянату свету мужчынская і жаночая зборныя Беларусі занялі трэція месцы. Першымі сталі самбісты з Расіі.

**3 «Крумкачы», абыграўшы «Дняпро», прабіліся ў наймацнейшы дывізіён чэмпіянату Беларусі.** Лік сустрэчы — 2:0. Адзначым, што «Дняпро» раней быў чэмпіёнам і прызёрам беларускага першынства, некалі таксама прымаў удзел у еўракубках. Клуб пад назвай «Крумкачы» з'яўляецца дастаткова маладым і існуе толькі 2 гады.

Нагадаем, раней пуцёўкі ў вышэйшы дывізіён атрымалі «Іслач» і «Гарадзея».

**4 Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова перамог у выязным матчы Лігі чэмпіёнаў сербскую «Вайводзіну» — 35:26.** Гэта дазволіла БГК вярнуць сабе другую пазіцыю ў групе С. Паядынак наступнага, восьмага тура Лігі чэмпіёнаў брэсцкія гандбалісты згуляюць са славацкім «Татранам», матч пройдзе ў Брэсце 21 лістапада.

Тым часам мінскі СКА, які ў Балтыйскай лізе ў суботу ўпэўнена перамог «Цэлтніекс», у нядзелю замацаваў поспех у паядынку з «Огрэ» — 47:22. Цяпер армейцы аднаасобна ўзначальваюць групу «А».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.40 | 17.08 | 8.28 |
| Віцебск — | 8.35 | 16.52 | 8.17 |
| Магілёў — | 8.30 | 16.58 | 8.28 |
| Гомель — | 8.20 | 17.01 | 8.41 |
| Гродна — | 8.54 | 17.25 | 8.31 |
| Брэст — | 8.48 | 17.32 | 8.44 |

### Месяц

*Першая квадра 19 лістапада. Месяц у сузор'і Вадалея.*

### Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Арсенія.*
***К.** Альжбеты, Валерыі, Валерыя, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 17 ЛІСТАПАДА

*Міжнародны дзень студэнтаў. Устаноўлены ў 1946 г. на Сусветным кангрэсе студэнтаў, які адбыўся ў Празе, у памяць чэшскіх студэнтаў-патрыётаў, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі 17 лістапада 1939 года.*

**1574** год — у Вільні на сродкі магілёўскіх купцоў Мамонічаў Пятром Мсціслаўцам заснавана друкарня. За час яе існавання было выдадзена звыш 80 кніг, з іх больш як 50 на старабеларускай мове. Былі выдадзены «Часоўнік», «Евангелле напрастольнае», «Псалтыр». Была адзінай беларускай друкарняй, якая выпускала зборнікі заканадаўчых актаў, выданні прававога характару, у тым ліку «Трыбунал абывацелям Вялікага княства Літоўскага», «Статут Вялікага Княства Літоўскага», канстытуцыі вальных соймаў, шэраг палемічных твораў у абарону уніі, напісаных І. Пацеем. Кнігі вызначаліся высокім паліграфічным і мастацка-арнаментальным афармленнем. Тут упершыню выкарыстаны выраблены Грынем Іванавічам курсіўныя шрыфты, якія ўзнаўляюць графіку канцылярскага пісьма.

**1790** год — нарадзіўся Аўгуст Мёбіус, нямецкі матэматык і астраном. Цікавасць да дакладных навук праявіў яшчэ ў раннім дзяцінстве. У 1803 годзе Мёбіус паступіў у каледж у Шульпфорце, затым — у Лейпцыгскі ўніверсітэт. Да 1825 года яго імя ўжо вядома ў навуковых колах. Яго самы значны ўклад у навуку — гэта «стужка Мёбіуса», якая з'явілася ў 1858 годзе як ілюстрацыя аднабаковых паверхняў. Акрамя гэтага, Мёбіус напісаў мноства вузкаспецыялізаваных работ па праектыўнай геаметрыі, тэорыі лікаў. У апошняй яго імем названа формула звароту, а таксама функцыя Мёбіуса. Таксама ён увёў паняцце ўнікурсальнай крывой, г. зн. графа, які можна намаляваць, не адрываючы пяра ад паперы (іншая назва эйлераў — граф). У галіне астраноміі Мёбіус апублікаваў некалькі значных работ па нябеснай механіцы, аб прынцыпах астраноміі і аб планетных зацьменнях.

**1870** год — 145 гадоў з дня нараджэння (г.п. Хоцімск) Сяргея Мікалаевіча Блажко, вядомага савецкага астранома, члена-карэспандэнта АН СССР (1929), заслужанага дзеяча навукі РСФСР (1934). У 1892 годзе скончыў Маскоўскі ўніверсітэт, дзе працаваў з 1896 года. Адначасова быў супрацоўнікам астранамічнай абсерваторыі ўніверсітэта (у 1920-1931 гадах — яе дырэктар). Аўтар навуковых прац па астрафотаметрыі і астраноміі. Упершыню сфатаграфаваў і раслумачыў спектры метэораў (1904), упершыню ў Расіі даследаваў вышыні іх згарання. Прапанаваў першую поўную тэорыю зацьменна-падвойных зорак (1911), новы метад выяўлення малых планет (1919). Сканструяваў шэраг астранамічных прыбораў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952). Памёр у 1956-м. Яго імем названы малая планета і кратар на адваротным баку Месяца.



Было сказана

**Максім ЛУЖАНІН, паэт, пісьменнік:**
*«Дзе на стале дармовы цукар — там і салодкія сябры».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

**Л**ЁН. У народнай творчасці лён заўсёды сімвалізаваў чыстыя думкі, дабрыню, таксама быў надзелены мужчынскімі якасцямі. У песнях лён называлі «сінявокім прыгожым юнаком».

◈ Калі ехалі на поле сеяць лён, гаспадар павінен быў пакласці ў насенне два яйкі. Затым на полі спачатку снедалі, і толькі потым распачыналі сяўбу. Шкарлупіны ад яек трэба было прывезці дадому. Лічылі, што ў такім выпадку лён будзе доўгім, як шлях ад хаты да поля і назад. Руплівыя гаспадыні малолі шалупайкі і дабаўлялі іх у корм курам, каб тыя лепш несліся.

◈ Існавала павер'е: «каб лён даў добры ўраджай, трэба было ў час сяўбы раздзецца, тады лён пашкадуе голую бабу і ўродзіць добра, каб ёй было з чаго пашыць кашулю».

◈ У нарадзе лічылі, што на палетках, дзе рос лён, нельга сеяць яравое збожжа, інакш «ні тое, ні гэтае не ўродзіць».

◈ Каб лён вырас доўгім, валакністым, раілі сеяць яго на малады месяц, а насенне збіраць па поўні.

◈ Паўсюдна на Беларусі існаваў звычай: ранняй вясной незамужнія дзяўчаты сеялі на агародзе палоску льну і па яе ўзыходах варажылі аб сваім лёсе. Адначасовае прарастанне і добры рост ільну прадказваў шчаслівую долю; калі ж узыходы былі дрэнныя — не бачыць дзяўчыне «жыцця-долі».

◈ Лён самым актыўным чынам выкарыстоўвалі ў вясельным абрадзе. Яго доўгія валокны нагадвалі аб дзявочай прыгажосці — доўгай касе. Таму цнатлівай нявесце ў косы ўплыталі валокны льну: каб лён добра ўрадзіў і каб нявеста парадавала радзіну нараджэннем здаровых дзяцей.

◈ Часам пры абсыпанні маладых пасля вянчання ў храме і на вяселлі выкарыстоўвалі насенне льну.

◈ Лён выкарыстоўвалі і ў народнай магічнай практыцы. Кісялі і напоі з насення льну ўжывалі пры захворваннях страўнікава-кішэчнага тракта.

◈ Народныя лекары раілі класці насенне льну ў абутак, тым самым ахоўваючы сябе ад сурокаў і іншых непрыемнасцяў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Перасунуў канапу да другой сцяны, таму што там разетка. Дадаў у рэзюме: «Спецыяліст па інтэр'еры».**

Голас жонкі са спальні:
— Дзе ты, мой прынц?
Голас мужа з прыбіральні:
— Я тут, мая прынцэса! На белым кані!

**Запіс у кнізе «Водгукаў і прапаноў» у адной з цырульняў: «Мяне цяпер не пазнаць. А вось вас усіх я запомніла, гады!».**

1 курс, першая пара па матаналізе ў тэхнічнай ВНУ, выкладчык:

— Запісваем тэму: Рэчаісная функцыя рэчаіснага пераменнага. Сюр'ектыўныя, ін'ектыўныя і біектыўныя функцыі.
Голас з задняй парты:
— Алё! Я перадумаў. Забярыце мяне ў войска!..

**А вось многія ўжо забыліся, што да вынаходства інтэрнэту людзі часам атрымлівалі ў вока за свае словы...**

— Паручнік Ржэўскі, што вы думаеце пра каханне з першага погляду?
— Гэта дзівосная штука! Страшна эканоміць час!




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў несуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4570.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 16 лістапада 2015 года.